творческий семейный проект по созданию коллажа «Увлекательная математика», который был реализован в рамках недели математики (рисунок 6).




**Рисунок 6 – Увлекательная математика**

Использование метода коллажа в начальной школе способствует развитию общих навыков работы с информационными технологиями, включая сбор и отбор информации, систематизацию данных, визуализацию, работу с цифровыми инструментами, коммуникацию и критическое мышление. Эти навыки необходимы для успешного обучения и будущей профессиональной деятельности учащихся.

Таким образом, коллажирование является мощным вкладом во всестороннее развитие детей, позволяя им не только учиться, но и обеспечивать свою индивидуальность посредством творчества.

Список использованных источников


1. Кривохижа, Ю. А. Эффективные методы и приемы работы с учащимися начальной школы на уроке. – URL: https://moluch.ru/conf/ped/archive/184/9114 (дата обращения: 30.03.2025).

2. Павлова, Е С. Креативные методы и приемы работы на уроках английского языка. – URL: https://moluch.ru/archive/184/47174 (дата обращения: 08.04.2025).


## СЛОЎНІКАВЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ЛЕКСІЧНЫХ НАВЫКАЎ ВУЧНЯЎ


**І.В. Чарнянок**
настаўніца пачатковых класаў
ДУА “Сярэдняя школа № 14 г. Мазыра” (г. Мазыр)
**Б.А. Крук**
дацэнт кафедры спецыяльнай педагогікі і методык дашкольнай і пачатковай адукацыі
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)



*Анатацыя. У артыкуле лексічная праца разглядаецца як сістэматычная і мэтанакіраваная дзейнасць педагога, скіраваная на авалоданне вучнямі лексікай роднай мовы праз розныя слоўнікавыя практыкаванні: паўнавартаснае засваенне імі семантыкі лексічных адзінак і правілаў іх ужывання ў мове, развіццё здольнасці ужываць дакладна і правільна лексічныя адзінкі ў розных маўленчых сітуацыях.*



*Ключавыя словы: лексічныя навыкі, слоўнікавыя практыкаванні, лексічная работа, актывізацыя слоўніка.*


МГПУ им. И.П. Шамякина

Рознымі аспектамі праблемы ўзбагачэння і актывізацыі слоўніка, удасканалення маўлення вучняў займаліся В. У. Протчанка, Л. П. Падгайскі, М. Г. Яленскі, М. П. Лукашук, Я. І. Івашуціч, Г. І. Верашчака і інш. У метадычнай літаратуры найбольш поўнае, на наш погляд, азначэнне лексічнай работы даў В. В. Давыдаў, які разумеў яе як «сістэматычную мэтанакіраваную работу ў галіне лексікі, што праводзіцца з мэтаю авалодання вучнямі незнаемым або знаемым, але цяжкім для іх слоўнікам» [1].

Праведзены аналіз падручнікаў для 2 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання, аўтарам якіх з'яўляецца В. І. Свірыдзенка, дазволіў упэўніцца ў дастатковай напоўненнасці іх практыкаванямі па развіцці слоўнікавага запасу вучняў. Аўтар падручнікаў засяроджваецца на комплексным навучанні маўленню. Разам з тым, варта было б адзначыць, што ва ўмовах рускамоўнага асяроддзя асаблівую ўвагу трэба звярнуць на гаварэнне як від маўленчай дзейнасці. На думку В. І. Свірыдзенкі, менавіта дзякуючы практыкаванням у вусным маўленні школьнікі «асэнсоўваюць і засвойваюць нормы літаратурнага вымаўлення, узбагачаюць слоўнік, набываюць асэнсаваныя ўменні ствараць і пашыраць выказванні, вучацца карыстацца суперсегментнымі этычнымі і экспрэсіўна-эмацыянальнымі сродкамі мовы» [2, с. 28].

А. Г. Асмолаў сцвярджае, што ўзбагачэнне слоўніка вучняў трэба разумець «не толькі як колькаснае яго павелічэнне, але і як якаснае змяненне, якое выражаецца ў пашырэнні аб'ему паняццяў, ва ўдакладненні значэнняў слоў, у азнаямленні з новымі значэннямі ўжо вядомых слоў» [3, с. 76].

У сваёй практыцы прапаную вучням лексічныя практыкаванні, скіраваныя на ўзбагачэнне і пашырэнне слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў. У кожнага вучня класа ёсць сшытак «Моўны куфэрак», у які яны прымацоўваюць тэматычныя групы слоў пасля ўрокаў і могуць карыстацца ім на працягу ўсіх урокаў. Дадзены «Моўны куфэрак» вучні папаўняюць на працягу чатырох класаў. У 2 класе яны самастойна запісваюць незнаемыя словы, перакладаючы іх на рускую мову.

Пасля вывучэння некалькіх тэматычных груп прапаную дзецям выканаць практыкаванні на паўтарэнне і кантралюю засваенне вучнямі гэтых груп слоў. Пры арганізацыі паўтарэння выкарыстоўваю лексічныя практыкаванні «Перакладчык», «Каляровы нататнік», «Знайдзі малюнак», «Крыжаванка», «Маляваныч» і інш.

1. «Перакладчык». Да дошкі выходзяць некалькі вучняў, астатнія дзеці класа называюць па 5–7 слоў на рускай мове. Задача вучняў, якія працуюць каля дошкі, правільна перакласці і запісаць словы на беларускай мове.

2. «Каляровы нататнік». Кожнаму вучню раздаюцца каляровыя нататнікі. На дошцы побач з адпаведным колерам размешчаны словы на беларускай мове. Настаўнік называе слова на рускай мове, вучні павінны "моўчкі" перакласці і паказаць адпаведны колер.

3. «Знайдзі малюнак». Вучням прапануецца картка, на якой змешчаны малюнкі і словы. Трэба прачытаць словы, разгледзець малюнкі і суаднесці малюнак з яго адпаведным графічным абазначэннем.

4. «Крыжаванка». Дзецям прапануецца крыжаванка і малюнкі. Трэба правільна запісаць словы пад адпаведнымі лічбамі. Можна прапанаваць малюнкі, загадкі або даць слоўнікавае тлумачэнне.

5. «Маляваныч». Вучням прапануецца картка з малюнкамі. Настаўнік называе слова на рускай мове і колер, у які яго трэба расфарбаваць. Вучні моўчкі перакладаюць слова і расфарбоўваюць малюнак у адпаведны колер.

У час вывучэння раздзелаў «Слова», «Сказ», «Тэкст» прапаную вучням практыкаванні «Блытанка», «Склад», «Згубленыя літары», «Працягні», «Алфавіт» і інш.

Пры вывучэнні раздзелаў «Значэнне слова», «Склад слова» вучні працуюць з лексічнымі практыкаваннямі «Утвары слова», «Моўная скарбонка», «Падбяры рыфму», «Адгадай слова» і інш.:

МДПУ ім. І.П. Шамякіна

1. «Утвары слова». Вучням прапануецца з дапамогай розных марфем утварыць новыя словы (*ляснік, пячнік, садоўнік*).

2. Утварыць сінанімічныя (антанамічныя) пары (*высокі – нізкі, асыпаецца, падае*).

3. Падабраць рад аднакаранёвых слоў (*сад, садоўнік, садавіна*).

4. «Моўная скарбонка». Вучням прапануюцца словы, сэнс якіх яны павінны растлумачыць. Разглядаецца некалькі ўзроўняў: спачатку трэба злучыць слова з яго значэннем, а пасля самому запісаць тлумачэнне дадзеных слоў.

5. «Падбяры рыфму». На картах запісаны словы ў слупок, і вучні павінны падабраць словы-рыфмы.

6. «Адгадай слова». Пасля прачытання прымет (апісанне) слова вучні павінны здагадацца, якое слова загадана.

7. «Фразеалагізм». Дзецям прапануюцца карткі з тэкстам, дзе ўжыты фразеалагізмы. Вучні павінны адшукаць іх і растлумачыць сэнс.

8. «Сэнс». На картках прапануецца растлумачыць сэнс слова з апорай на яго марфемную будову.

9. «Лішняе». На картках запісаны словы. Трэба прачытаць і знайсці лішняя слова (*мора, марак, марыць*).

10. На картках запісаны тэкст, у якім паўтараецца адно і тое ж слова. Трэба замяніць слова блізкім па значэнні, каб атрымаўся звязны тэкст.

Паказчык эфектыўнасці лексічнай работы – актыўнасць вучняў на ўроку, жаданне вучыць новыя словы, чытаць творы на роднай мове і, безумоўна, прыгожа размаўляць і выказваць свае думкі па-беларуску. Слоўнікавую работу нельга адрываць ад працы над усімі аспектамі моўнага развіцця. Лексічны запас вучняў знаходзіцца ў пастаянным руху, і належыць разглядаць яго ў сувязі з працай над звязным маўленнем вучняў.

Апісаны педагагічны вопыт фарміраваўся на працягу чатырох гадоў. Станоўчая дынаміка вынікаў зрэзаў, праведзеных з мэтай кантролю якасці засваення лексікі пэўнай тэматычнай групы слоў, сведчыць пра станоўчы ўплыў практыкаванняў на пашырэнне і паглыбленне слоўнікавага запасу вучняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Давыдаў, В. В. Тэорыя развіваючага навучання : манаграфія / В. В. Давыдаў. – Мінск : ІНТАР, 2016. – 544 с.

2. Свірыдзенка, В. І. Методыка выкладання беларускай мовы / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : БГПУ, 2023. – 123 с.

3. Асмолаў, А. Г. Як праектаваць універсальныя навучальныя дзеянні ў пачатковай школе. Ад дзеяння да думкі. Дапаможнік для настаўніка / А. Г. Асмолаў. – Мінск : Асвета, 2011. – 350 с.

4. Протчанка, В. У. Жывое слова ў методыцы навучання роднай мове / В. У. Протчанка // Беларуская мова і літаратура. – 1998. – № 1. – С. 39.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ РАЗНОУРОВНЕВЫХ ЗАДАНИЙ НА УРОКАХ МАТЕМАТИКИ НА I СТУПЕНИ ОБЩЕГО СРЕДНЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

**Н.П. Ширшова**
учитель ГУО «Средняя школа № 9 г. Мозыря» (г. Мозырь)

*Аннотация. Статья посвящена изучению использования разноуровневых заданий на уроках математики на первой ступени общего среднего образования. В материале рассматривается следующая проблема: как с помощью разноуровневых заданий повысить учебную деятельность младших школьников на уроках математики.*

*Ключевые слова: разноуровневые задания; дифференциация; уроки математики; начальные классы.*

Одной из главных задач для учителя в современной школе является всемерное содействие развитию познавательных способностей учащихся и воспитание всесторонне

МГПУ им. И.П. Шамякина